# Найбагацейшая кнігахавальня БССР

Беларуская Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна, створаная 15 год таму назад, стала цяпер адной з буйнейшых кнігахавалень Саюза. Яна мае кніжны фонд у паўтара мільёна тамоў. У яе выдатным будынку — многа светлых і прасторных чыталень і габінетаў, багаты польскі і яўрэйскі аддзелы, габінет рабочага чытача. Бібліятэку штодзенна наведвае каля 1.000 студэнтаў, навуковых работнікаў, камандзіраў Чырвонай Арміі, рабочых менскіх прадпрыемстваў. Бібліятэка стварыла свае філіялы пры доме Ўрада ў Менску і ў гарадах: Гомелі, Магілеве і Віцебску. Растуць культурныя сувязі бібліятэкі з заграніцай: наладжан сістэматычны кнігаабмен з 300 навуковымі ўстановамі, універсітэтамі, бібліятэкамі Еўропы і Амерыкі.

Наркамат асветы БССР намеціў пабудову ў 1937 г. другой чаргі бібліятэкі. Будзе пабудавана шасціпавярховая 11-ярусная кнігахавальня на два мільёны тамоў.